# ЖЕВЛАКОВ ВАСИЛИЙ НИКОЛАЕВИЧ






Вайна... Час цяжкіх выпрабаванняў, цяжкае, горкае ліхалецце. Яна зазірнула амаль што ў кожную хату, прыносячы з сабой жах, боль, слёзы. Не абышла бокам вайна і маю сям'ю.

Мне хацелася б успоміць гісторыю жыцця майго прадзеда Васіля Мікалаевіча. Ён нарадзіўся 20 мая 1927 года ў простай сялянскай сям'і ў вёсцы Нямкі. Да вайны скончыў сем класаў. У свае сямнаццаць гадоў быў прызнаны прыдатным да службы і ў 1944 годзе накіраваны ў 38 стралковы полк, дзе праходзіў службу да канца 1945 года.

Знамянальнай у гэты час была Усходне-Памеранская аперацыя, у якой удзельнічаў мой прадзед і якая садзейнічала руху савецкіх войскаў у напрамку Берліна. Як успамінаў дзядуля, гэта быў цяжкі пераход. Яны доўгі час ішлі на марозе, многія не вытрымлівалі, захворвалі. Потым месяцы цяжкіх баёў і, нарэшце, доўгачаканая перамога. Паў Данцыг і яны выйшлі да Балтыйскага мора.

Дзень Перамогі Васіль сустрэў у баях каля Берліна. Далей Першы балтыйскі флоцкі экіпаж, штодзённая праца на Кіраўскім заводзе, калі па 14 часоў разбіралі металалом на пераплаўку. Праз год Васіль Мікалаевіч быў пераведзены ў воінскую частку нумар 87310, дзе і знаходзіўся да 1951 года на пасадзе тэлефаніста. У канцы 1951 года звольнены ў запас. Але і мірнае жыццё трэба было будаваць спачатку.

Мой прадзед, як і многія людзі, не сядзеў склаўшы рукі. У калгасе ён працаваў рахункаводам, затым скончыў Сельскае прафтэхвучылішча па спецыяльнасці «фельчар».

У 1972 годзе разам з сям'ёй пераехаў у горад Бабруйск на пастаяннае месца жыхарства, дзе працаваў на мэблевай фабрыцы імя Халтурына да выхаду на пенсію. Памёр Васіль Мікалаевіч у красавіку 2000 года, выхаваў 4 дзяцей, 6 унукаў, паспеў убачыць і мяне – першую сваю праўнучку. За час свайго жыцця ён быў узнагароджаны шматлікімі медалямі, сярод іх і медаль за пабеду над Германіяй. Многія гады ён заставаўся адным з першых у працы і атрымаў медаль «Ветэран працы». Светлая памяць пра гэтага чалавека будзе заўсёды жыць у нашых сэрцах.



ВОЕННЫЙ БИЛЕТ
НБ № 0392215

Фамилия Жевлаков
Имя Василий
Отчество Николаевич
Число, месяц и год рождения 20 мая 1927 г.
Личная подпись владельца
Выдан Кировским Районным военным комиссариатом Могилевской области (республики)
«10» января 1963 г.
ВОЕННЫЙ КОМИССАР
М. П.
(звание, подпись)

НБ № 0392215 1

I. Общие сведения

1. Место рождения дер. Немки, Кировский р-н Могилевская обл.
2. Национальность белорус
3. Партийность (с какого года) беспарт.
4. Состоит ли в ВЛКСМ (с какого года)
5. Образование 7 классов, в 1964 Сельск. Профтехучилище в 1970
6. Основная гражданская специальность счетовод. фельдшер.
7. Семейное положение женат, жена Галина Васильевна

Материал подготовила:
Жевлакова Анастасия Юрьевна
преподаватель кафедры «Таможенное дело»,
аспирант кафедры «Менеджмент»

Белорусский национальный технический университет

Управление по воспитательной работе с молодежью

Выставка "История Великой
Отечественной войны в лицах"

А. Ю. Жевлакова

# ЖЕВЛАКОВ
# ВАСИЛИЙ НИКОЛАЕВИЧ

Минск БНТУ 2023